Спіс выкарыстаных крыніц

1. Старычонак В.Д. Беларуская літаратура: дапам. для абітурыентаў. – 3-е выд. – Мінск, 1995. – С. 192.

2. Верціхоўская М.І. Беларуская літаратура: білеты ў пытаннях і адказах. – 2-е выд. – Мінск, 2002. – С. 89

3. Мантур, А.Я. Індывідуальна-аўтарскія неалагізмы Рыгора Барадуліна і іх рускія эквіваленты / А.Я. Мантур // Роднае слова. – 2015. – №7. – С. 45 – 48.

4. Бородулин Р.И. Опрокинутое = Перакуленае. – Москва, 2010 512 с.

УДК 159.925

## МОВА ЖЭСТАЎ

*Студэнты – Гаўрылюк Я.Я., 33 тс, 1 курс ФТС;*
*Максімовіч С.І., 2 мпт, 1 курс АМФ*
*Навуковыкіраўнік – Мантур А.Я., ст. выкладчык*
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Мова – найважнейшы сродак зносін паміж людзьмі. Дзеля таго каб існаваць, людзі павінны дамовіцца паміж сабою пра супольныя справы, размеркаванне абавязкаў, пра вызначэнне агульных планаў і г.д. Ажыццяўленне падобнага тыпу патрэб і дасягаецца пры дапамозе мовы [1, с. 5]. Сукупнасць дапаможных сродкаў зносін таксма называюць “мовай”. У паўсядзённым жыцці мы таксма карыстаемся мовай жэстаў, мовай мімікі, мовай рухаў [2, с. 9].

Аўстралійскі спецыяліст А. Піз сцвярджае, што пры дапамозе слоў перадаецца 7 % інфармацыі, гукавых сродкаў – 38 %, мімікі, жэстаў, паставы – 55 % [3, с. 15 – 22].

Большасць даследчыкаў падзяляюць меркаванне, што слоўны (вербальны) канал выкарыстоўваецца для перадачы інфармацыі, у той час як невербальны канал ужываецца для “абмеркавання” міжасобасных зносін, а ў некаторых выпадках выкарыстоўваецца замест слоўных паведамленняў. Напрыклад, жанчына можа выразна перадаць сваё стаўленне мужчыне праз погляд, нічога пры гэтым не сказаўшы.

Ахарактарызуем асноўныя тыпы сігналаў цела:

1. **Пастава**. Пад паставай мы разумеем не толькі становішча, якое прымае чалавек, але і рухі, якія змяняюць гэтае становішча або ўплываюць на яго, як, напрыклад, перамяшчэнне цэнтра цяжару пры калыханні наперад-назад, з наска на пятку, змена нагі і т.п.

**2. Міміка**. Да міміцы мы адносім усе змены, якія можна назіраць на твары чалавека, у тым ліку і псіхасаматычныя працэсы, напрыклад пачырваненне.

**3. Дыстанцыянаванне**. Тут гаворка ідзе аб дыстанцыі, якую прытрымліваецца адзін чалавек адносна іншага, а таксама нечаканыя рухі, якія маюць на мэце змяненне дыстанцыі, напрыклад, рэзкі крок назад і т.п.

**4. Інтанацыя.** Пад інтанацыяй маюцца на увазе ўсе з'явы, звязаныя з голасам і не патрабуюць канцэнтрацыі нашай увагі на змесце сказанага. Гэта сама інтанацыя, мелодыя прамовы, наяўнасць і працягласць паўзаў, гучнасць голасу, рытм прамовы і г.д. Пад інтанацыяй мы разумеем таксама гукі неславеснага зместу, напрыклад уздыхі і т.п.

Ва ўсім свеце **асноўныя камунікатыўныя** жэсты не адрозніваюцца адзін ад аднаго. Калі людзі шчаслівыя, яны ўсміхаюцца, калі яны сумныя – яны пахмурныя, калі злуюцца – у іх злосны погляд.

**Ківанне галавой** амаль ва ўсім свеце азначае «так» або пацверджанне. Гэты жэст таксама выкарыстоўваецца глухімі і сляпымі людзьмі.

**Калыханне галавой** выкарыстоўваецца для выказвання сваёй нязгоды і адмоўнага стаўлення.

**Усмешка** была першапачаткова сімвалам пагрозы, але сёння, у сукупнасці з прыязнымі жэстамі, яна азначае задавальненне або добразычлівасць.

Жэст **паціскание плячыма** з'яўляецца добрым прыкладам універсальнага жэсту. Гэта значыць, што чалавек не ведае ці не разумее, пра што ідзе гаворка. Хоць зносіны з дапамогай рухаў цела ажыццяўляюцца на працягу больш за мільён гадоў, навуковае вывучэнне гэтай з'явы пачалося толькі ў апошнія дзесяцігоддзі.

Нягледзячы на даволі значную ўвагу вучоных да гэтай праблемы [3, 4], перад даследчыкамі пастаўлены яшчэ шмат нявырашаных пытанняў.

Спіс выкарыстаных крыніц

1 Занкавіч, А.П. Беларуская мова. Прафесійная лексіка: дапаможнік па вывучэнню дысцыпліны. – Мінск, 2006. – С. 5.

2. Зразікава, В.А. Беларуская мова. Эканамічная лексіка: вучэб. дапам. – Мінск, 2012. – С. 9

3. Піз, А. Мова рухаў цела. Як чытаць думкі па жэстах. – Масква, 2003. – С.15 – 22.

4. Бікрэнбіл, В. Мова інтанацыі, мімікі, жэстаў. Санкт-Пецярбург, 1997. – 224 с.